# Выбраць інжынерныя прафесіі

**Вопытам паспяховай прафарыентацыі і работы інжынерна-тэхнічнага цэнтра падзяліліся ў сярэдняй школе № 1 імя Героя Савецкага Саюза П.А.Акуцыёнка Шуміліна.**

Фізіку і матэматыку Наталля Бурэль выкладае ў школе больш за 10 гадоў, у інжынерных класах працуе трэці год. З 9 сёлетніх выпускнікоў першага такога класа 8 выбралі інжынерныя спецыяльнасці і адзін вырашыў стаць, як і Наталля Анатольеўна, настаўнікам фізікі і матэматыкі. Сёння яны ўжо студэнты ВДТУ, ВДУ імя П.М.Машэрава, ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай і БДУ, прычым ёсць сярод іх і мэтавік, які вучыцца ў Полацку. Па словах педагога, па-за межамі ўрокаў ключавымі складнікамі сістэмы дапрофільнай і профільнай падрыхтоўкі з'яўляюцца факультатыўныя заняткі "У свеце тэхнікі і тэхналогій: выбіраем інжынерную прафесію" і "Вывучэнне асноў робататэхнікі", а таксама аб'яднанне па інтарэсах "Асновы робататэхнікі" для навучэнцаў 4 класаў.

> *Прыадкрыю сакрэт: да прафесійнага свята нашы навучэнцы рыхтуюць педагогам высокатэхналагічныя 3D-сувеніры.*
>
> **Вольга ДАЛЕЦКАЯ.**

— Да нядаўняга часу інжынерны напрамак мы вялі ў школе разам з маёй калегай Юліяй Глаўдзель, — адзначыла настаўніца. — Менавіта яна працавала ў аб'яднанні па інтарэсах з чацвёртакласнікамі і дасягнула з вучнямі значных поспехаў: у прыватнасці, яны спачатку ўвайшлі ў прызавую тройку, а затым узначалілі штогадовы абласны рэйтынг па робататэхніцы. Паколькі цяпер Юлія Анатольеўна ў дэкрэтным водпуску, мне давялося поўнасцю ўзяць справу ў свае рукі. Нашы дзеці вельмі таленавітыя. Мы імкнёмся максімальна раскрыць іх патэнцыял і радуемся, калі нам гэта ўдаецца. У школьнай скарбонцы ўзнагарод — дыпломы за перамогі на абласных дыстанцыйнай алімпіядзе па праграмаванні ў асяроддзі Scratch, навукова-практычнай канферэнцыі "КВАНТ" і каманднай інжынернай алімпіядзе (дарэчы, тут мы трымаем лідарства другі год запар).

> Раённы іжынерна-тэхнічны цэнтр на базе ўстановы адукацыі быў адкрыты ў снежні 2024 года. Выніковасць яго работы відавочная. Аднымі з прыярытэтных напрамкаў вызначаны праектная дзейнасць і супрацоўніцтва з Нацыянальным дзіцячым тэхнапаркам.

У яго профільных зменах ужо прынялі ўдзел тры прадстаўнікі школы, якія цікавяцца тэхнічнымі навукамі, некаторыя з іх — неаднаразова. На сёння пададзена чарговая заяўка і яшчэ некалькі навучэнцаў шчыруюць над сваімі праектамі, каб прайсці адборачныя туры. Традыцыйна школа выступае пляцоўкай для правядзення раённых кірмашоў мэтавай падрыхтоўкі "Я выбіраю прафесію"для профільных класаў інжынернай накіраванасці. У цэнтры дзеці займаюцца 3D-мадэляваннем у праграмах "КОМПАС-3D", AUTODESK Tinkercad і Blender, асвойваюць асновы праграмавання, канструявання, робататэхнікі з выкарыстаннем камплектаў "РОББО" і схематэхнікі, вучацца рабіць праекты і публічна абараняць іх, бліжэй знаёмяцца з тэхнічнымі спецыяльнасцямі, каб зразумець, якія навыкі і веды неабходны для паспяховай кар'еры ў той ці іншай галіне.

— Інжынерна-тэхнічны цэнтр дзейнічае на базе кабінета інфарматыкі, і яго работа сумешчана з адукацыйным працэсам, — расказала дырэктар школы Вольга Далецкая. — Гэта дазваляе педагогам значна павышаць якасць навучання, выкарыстоўваючы базу цэнтра для правядзення практычных заняткаў, дэманстрацыі эксперыментаў і доследаў, напрыклад, на факультатывах па фізіцы і матэматыцы ў рамках профільнага навучання. Праектная дзейнасць будучых інжынераў цесна звязана з рознымі навукамі, уключаючы геаграфію, біялогію, хімію і фізіку, а таксама з рознымі галінамі народнай гаспадаркі. Дзяцей цікавяць у тым ліку аграрны сектар і транспарт, складанне бізнес-праектаў. Пад кіраўніцтвам настаўнікаў яны з задавальненнем распрацоўваюць мадэлі і раздрукоўваюць на 3D-прынтары прома-прадукцыю. У прыватнасці, мы ўручаем арыгінальныя магніцікі гасцям школы. Прыадкрыю сакрэт: да прафесійнага свята нашы навучэнцы рыхтуюць педагогам высокатэхналагічныя 3D-сувеніры.




У цэлым азначаны комплекс заняткаў, мерапрыемстваў, конкурсаў выдатна матывуе і арыентуе школьнікаў на канкрэтную прафесійную сферу. Яны мэтанакіравана з 10 класа выбіраюць для сябе інжынерныя прафесіі. Разам з тым у цэнтры назапашваюцца каштоўны педагагічны вопыт і эфектыўныя метадычныя распрацоўкі, якімі мы актыўна дзелімся з калегамі.

Магутны імпульс да развіцця дае партнёрства з установамі вышэйшай адукацыі. Так, у адпаведнасці з дагаворам, заключаным паміж школай і ВДТУ, навучэнцы груп інжынернай накіраванасці з Шуміліна рэгулярна наведваюць адукацыйныя і выхаваўчыя мерапрыемствы на базе тэхналагічнага ўніверсітэта. Прыносіць плён і ўзаемадзеянне з рэальным сектарам эканомікі. Напрыклад, школа заключыла дагавор з мясцовым філіялам "Віцебскія электрычныя сеткі" РУП "Віцебскэнерга". Згаданы вышэй выпускнік-мэтавік пасля заканчэння навучання вернецца ў раён дыпламаваным спецыялістам і будзе працаваць на гэтым прадпрыемстве. У планах школы — арганізаваць серыю майстар-класаў і семінараў для педагогаў раёна ў рэчышчы дзейнасці інжынерна-тэхнічнага цэнтра і яшчэ шырэй выкарыстоўваць яго магчымасці для фарміравання прадметных і метапрадметных кампетэнцый, прафесійнага вызначэння навучэнцаў. Таму што гэта месца, дзе мары пераўтвараюцца ў веды, веды — у праекты, а праекты — у рэальныя справы.

**Таццяна БОНДАРАВА.**

**Фота аўтара.**